культуры сведчаць аб тым, што гэты феномен вельмі складаны. Можна дапусціць думку, што псіхалагічная культура ёсць інтэграцыя ўнутраных псіхалагічных і знешніх сацыяльных з'яў, якая праяўляецца ў жыцці чалавека ў адпаведнасці з яго свядомасцю. Гэта праяўленне складаецца з трох кампанентаў: эмацыянальнага, пластычнага і паводзін.

І далей, калі лічыць, што ў аснове разумення культуры стаіць чалавек, то псіхалагічная культура асобы ляжыць ў аснове культуры чалавека ў цэлым.

Прапанаваны падыход дазваляе на прагматычным узроўні займацца мэтанакіраваным развіццём псіхалагічнай культуры чалавека.

Агп-Селязнёў І.Ф.,
докт.філас.навук,
дацэнт
Казак В.В.,
выкладчык БДПА

# КАНЦЭПЦЫЯ МАСТАЦКА-ЭСТЭТЫЧНАЙ АДУКАЦЫІ Ў СІСТЭМЕ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ БЕЛАРУСІ

У час адраджэння нацыянальнай культуры перад беларускім народам стаяць важнейшыя задачы нацыянальнага духоўна-культурнага, сацыяльна-эканамічнага, навукова-тэхнічнага прагрэсу. Іх вырашэнне залежыць ад стварэння сучаснай мадэлі бесперапыннай адукацыі на аснове якаснага пераўтварэння ўсяго навучальна-выхаваўчага працэсу. Для гэтага неабходна наступнае.

1. Аб'ектыўна-гістарычнае прызнанне і сцвярджэнне фундаментальнай ролі мастацка-эстэтычнай культуры ў сістэме адукацыі, уключаючы развіццё, выхаванне і навучанне асобы.

2. Сацыяльна-каштоўнаснае прагназіраванне зместу прадметаў мастацка-эстэтычнага цыкла на аснове нацыянальнай беларускай культуры і агульначалавечых сусветных прыярытэтных вартасцей з улікам заканамернасцей мастацка-эстэтычнага развіцця асобы.

3. Дыялектыка-творчае вырашэнне існуючых супярэчнасцей і пошук гарманічна сінтэзаваных суадносін мастацтва і навукі як дзвюх палярных форм (сродкаў, метадаў) развіцця цэласнага, гарманічнага, універсальнага чалавека.

З улікам гэтага выкладчыкам неабходна мець выразнае ўяўленне па наступных пытаннях:

1. Суадносіны цыкла прадметаў мастацтва і навукі ў навучальна-выхаваўчым працэсе павінны вызначацца разумнай мерай і гармоніяй, таму што пры іх узаемадзеянні нараджаецца новы прадукт чалавечай думкі - сінтэзаванае пазнанне і адлюстраванне, якія з'яўляюцца фундаментальнай асновай развіцця любой творча-пераўтваральнай дзейнасці (гэта раскрываецца на мадэлі школы "Універсум").

2. Працэс сінтэзацыі мастацтва і навукі сацыяльна і прыродна аб'ектыўны, дзякуючы асобай уласцівасці руху матэрыі ("уласцівасць поліпараметрызму") і яго спецыфічнага праяўлення праз "закон свабод(ы)насці параметраў" (ЗСП). ЗСП аб'ектывіруе развіццё асобы пры варыянтна-творчым, мастацка-эстэтычным асваенні рэчаіснасці, стварэнні духоўных, інтэлектуальных і матэрыяльных вартасцей.

3. Духоўная культура чалавека абапіраецца на эмацыянальную і сенсорную культуру праз з'яву "катарсісу" - ад суперажывання да ўзрушэння адкрыцця. Важнейшымі задачамі мастацка-эстэтычнай адукацыі з'яўляюцца: фарміраванне мастацкага ўспрымання, выхаванне пачуццяў, талерантнасці ацэнак агульнай культуры (і рэлігіі) асобы, развіццё сенсорных здольнасцей, вобразнага мыслення, творчай дзейнасці.

4. Працэс адукацыі і выхавання мастацка-эстэтычнымі сродкамі ўяўляецца цэласнай і паслядоўнай сістэмай развіцця культуры мастацкага творчага мыслення пры засваенні моў мастацтва. Пры такім падыходзе раскрываюцца міжпрадметныя сувязі, таму што пры своеасаблівасці вобразных сродкаў агульныя заканамернасці мастацкага мыслення і культуры ў цэлым адзіныя.

Сучасны стан школы сацыяльна небяспечны. Мастацка-эстэтычная культура і адпаведна нацыянальная беларуская культура, мастацтва ў сістэме адукацыі выступаюць як прымат у агульным навучальна-выхаваўчым працэсе, хоць яны павінны стаць фундаментальнымі, таму што чалавек "навуковы" ёсць працяг чалавека "мастацкага". Іменна мастацка-эстэтычная дзейнасць з'яўляецца важнейшай формай самавыяўлення чалавека і адзінай формай адлюстравання духоўнага жыцця.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Школа не спраўляецца з задачай фарміравання асобы з-за дамінуючай інфармацыйна-экстэнсіўнай сістэмы навучання. Прыніжэнне духоўных пачаткаў татальна падаўляе, нівеліруе індывідуальнасць чалавека. Недаацэньваецца пачуццёвае ўспрыманне як першаснасць пазнання і аснова ў навучанні.

Існуючыя ўмовы, сродкі навучання не садзейнічаюць спасціжэнню Ісціны, Дабра і Прыгажосці.

Школа аказалася ва ўмовах канцэпцыі "навуковай" адукацыі і выхавання з ідэяй забеспячэння чалавека ведамі і ўпэўненасцю ў тым, што сацыяльны лад і вытворчыя адносіны і так зробяць чалавека духоўным, творчым, маральным. Адной інфармацыяй чалавека не створыш. Страта духоўнасці, маральнасці, жадання тварыць шкодны і для навукі, і для сацыяльнага ладу, усіх галін жыцця. І мы сталі сведкамі гэтага.

Такім чынам, асноватворныя мэты мастацка-эстэтычнай адукацыі (якія з'яўляюцца важнейшымі кампанентамі фарміравання духоўнай культуры чалавека, яго інтэгратыўным сацыяльна-культурным паказчыкам) наступныя: Духоўнасць, Інтэлектуальнасць, Маральнасць, Сцвярджальнасць нацыянальна-агульначалавечага, гэта значыць Цывілізаванасць і Прыгажосць.

Жалуновіч А.А.,
канд.філал.навук,
ст.выкладчык
Кутырова Г.Р.,
ст.выкладчык

## НАВУКОВАЕ І ПРАКТЫЧНАЕ ЗНАЧЭННЕ КУРСА ЭТНАЛІНГВІСТЫКІ Ў ПРАЦЭСЕ ПАДРЫХТОЎКІ КАДРАЎ КУЛЬТУРЫ

Імклівае развіццё навукі і тэхнікі, змены ў жыцці грамадства, новае ў побыце людзей - усё адлюстроўваецца ў мове. Першыя звесткі аб узнікненні слоў сведчаць аб тым, як цяжка правесці мяжу паміж гісторыяй рэалій і гісторыяй слоў. Іх узаемасувязь і ўзаемаабумоўленасць - мост паміж словам і жыццём, гісторыяй грамадства, паміж мовай і культурай народа.

Бясспрэчным з'яўляецца сцвярджэнне, што народ больш поўна і дакладна выяўляе сябе ў сваёй мове. Таму ў цяперашні час, час адраджэння беларускай нацыянальнай культуры, выключна актуальным з'яўляецца пытанне аб захаванні для нашчадкаў тых моўных крыніц, якія складаюць значную частку духоўнай культуры беларускага народа.

Базай падрыхтоўкі спецыялістаў, прафесійная дзейнасць якіх павінна забяспечваць развіццё нацыянальнай культуры, з'яўляецца Беларускі універсітэт культуры. Адказнасць вышэйшай установы перад грамадствам у падрыхтоўцы і выхаванні высокакваліфікаваных культуролагаў патрабуе больш грунтоўных адносін да стварэння вучэбных планаў і арганізацыі навучальнага працэсу. На наш погляд, у змест навучання студэнтаў культуралагічнага факультэта абавязкова павінен быць уключаны курс этналінгвістыкі. Этналінгвістыка - параўнальна малады раздзел мовазнаўства. Але за час свайго развіцця этналінгвістыка ўзбагацілася каштоўнымі фактамі, назіраннямі і абагульненнямі, якія маюць цікавасць для пераважнай большасці гуманітарных навук. Вядомыя сучасныя этнографы і фалькларысты неаднаразова звярталі ўвагу на неабходнасць прафесійнай лінгвістычнай падрыхтоўкі пры зборы і навуковай апрацоўцы культурна-этнаграфічных матэрыялаў. Не з'яўляецца сакрэтам тое, што шмат хто са студэнтаў і нават супрацоўнікаў, знаходзячыся ў фальклорных экспедыцыях у розных культурна-этнаграфічных раёнах, дазваляюць сабе "выпраўляць" і "ўдасканальваць" вымаўленне слоў у народных казках, паданнях і песнях. Такі некваліфікаваны падыход не толькі не спрыяе захаванню моўнай спадчыны, але выклікае блытаніну і супярэчнасці. Па сутнасці выкрэсліваюцца адметнасць мясцовага народнага твора, яго арыгінальнасць і непаўторнасць, чаго ў такой дакладнай справе быць не павінна. Тут непазбежна закранаецца пытанне захавання зместу і асабліва формы народнага твора.

Каб пазбегнуць такіх разбуральных для беларускай культуры з'яў, трэба сфарміраваць у студэнтаў асэнсаваныя адносіны да мясцовай мовы. Толькі забеспячэнне іх усебаковымі ведамі, з аднаго боку, фактычным валоданнем фальклорнай спадчыны, а з другога, моўнымі каштоўнасцямі гэтай спадчыны дазволіць падняць падрыхтоўку нашых выхаванцаў да ўзроўню сённяшніх патрабаванняў універсітэцкай адукацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ